*С. В. Мяньчэня*

# АЛКАГОЛЬ У ЖЫЦЦІ СЯЛЯН ЛЕПЕЛЬШЧЫНЫ ПАЧАТКУ XX ст. (паводле твораў А. Пшчолкі)

Аляксандр Раманавіч Пшчолка (1869–1943) з'яўляецца дастаткова спрэчнай фігурай у гісторыі беларускай літаратуры і фалькларыстыкі. Нарадзіўся ён у вёсцы Чарсцвяды Лепельскага павета ў сям'і праваслаўнага святара. Скончыў Полацкае духоўнае вучылішча, затым Віцебскую семінарыю. Служыў у Віцебскім Маркавым манастыры, пасля быў псаломшчыкам, народным настаўнікам, чытаў лекцыі па агародніцтве і садаводстве ў сельскагаспадарчай школе. Скончыў юрыдычны факультэт Юр'еўскага ўніверсітэта (у сучасным г. Тарту, Эстонія). Працаваў адвакатам у Віленскай, Курляндскай і Эстляндскай губернях. З пачаткам Першай сусветнай вайны пераехаў у Гарадок, дзе працаваў у аддзеле народнай адукацыі. З 1918 г. жыў і працаваў у Полацку.

З 1898 г. А. Пшчолка пачаў публікаваць творы, якія сталі вынікам яго падарожжаў па Лепельскім павеце. Сярод іх «Дзяды», «Мікітавы хаўтуры», «Зажынкі і абжынкі», «Беларускія святы», «Талака», «Янкава скарга». У 1908 г. па яго ініцыятыве была праведзена беларуская вечарына ў Вільні, у 1910 г. выдадзена паэма «Тарас на Парнасе». А. Пшчолка ліставаўся з Я. Карскім, Б. Эпімахам-Шыпілам [1, с. 71–72].

У 1926 г. А. Пшчолка ў артыкуле «Вражда из-за языка» выступіў супраць беларусізацыі як палітыкі навязвання беларускай мовы. Гэта выклікала хвалю абурэння ў перыядычным друку. На старонках «Савецкай Беларусі» выйшлі артыкулы «Хто яны?» [9] і «Пшчолка і “Вражда из-за языка”» [8]. Тут А. Пшчолку прыпомнілі яго супрацоўніцтва з праўрадавымі і чарнасоценнымі выданнямі Расійскай імперыі, абвінавацілі ў антыбеларускай і антысавецкай дзейнасці сярод полацкіх настаўнікаў. Асобна адзначаўся ўдзел А. Пшчолкі ў якасці прысяжнага перакладчыка з беларускай на рускую мову на судовым працэсе супраць «Нашай долі». Сцвярджалася, што яго няякасны пераклад спрыяў прыняццю рашэння аб асуджэнні рэдактара і закрыцці газеты [тамсама].

У 1927 г. А. Пшчолка пакінуў Беларусь і пераехаў у г. п. Старая Таропа Цвярской вобласці, дзе і памёр у 1943 г.

А. Пшчолка не лічыў сабе этнографам ці даследчыкам. Аднак яго творы ўтрымліваюць багаты этнаграфічны матэрыял – апісанне народных святаў, пахавальнага і вясельнага абрадаў Лепельшчыны і інш. У іх раскрываюцца некаторыя побытавыя бакі жыцця сялян, з якіх цікавым аспектам з'яўляецца месца алкаголю ў традыцыйных святах, сямейнай абраднасці і паўсядзённасці сялян. Сам аўтар адмоўна адносіўся да народнага п'янства, прысвяціўшы гэтай праблеме асобнае выданне «Гарэлка (адказ сялянам)», дзе асуджаў

звычкі сялян, звязаныя са спажываннем алкаголю, і прыводзіў прыклады безалкагольных урачыстасцей, якія, праўда, сялянамі не ўспрымаліся з прычыны неадпаведнасці традыцыям [4].

**Дзе сяляне знаходзілі алкаголь?** У «старыя часы», калі «жиды па корчмах сидели», знайсці алкаголь не складала ніякіх цяжкасцей. «Благодетели крестьянские» – карчмары – вялі гандаль у любы час, за наяўныя грошы, прадукты ці рэчы. Сітуацыя змянілася з увядзеннем «винополии» – дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць і продаж гарэлкі і стварэння сістэмы вынаснога гандлю праз дзяржаўныя «вінныя» крамы, альбо манапольки, ці вінапольки [5, с. 12]. З гэтага часу корчмы пазачыняліся, а продаж гарэлкі строга рэгламентаваўся па часе і ажыццяўляўся толькі за грошы.

Манапалькі пераўтвараюцца ў асноўныя месцы продажу гарэлкі, аднак пры жаданні ці неабходнасці можна было звярнуцца і да былых карчмароў. Так, Сямён, адзін з герояў апавядання «Мікітавы хаўтуры» вечарам едзе па гарэлку для арганізацыі пахавання бацькі да Мордуха, у мінулым самага багатага карчмара акругі, бо манаполька ўжо зачынена. У Мордухавай хаце Сямён застае пяць мужыкоў, якія п'юць гарэлку. Гарэлка ў гаспадара – з манапалькі, на якіх умовах ён яе прадае і дазваляе распіваць, не паведамляецца. Мордух скардзіцца на жыццё: «Теперь строго... теперь нам на этот счёт, ох как плохо, хоть совсем помирай»[1] [5, с. 13]. Аднак пасля непрацяглых перамоваў і дадатку да грошай меха аўса згаджаецца прадаць «чацвертную бутыль» (1/4 вядра ≈ 3 л). Набытую гарэлку пераліваюць у бочачку, каб не было доказаў продажу. Тое, што Мордух гандлюе гарэлкай, ведаюць усе, і ўсе адкрыта пра гэта кажуць і не бачаць у гэтым нічога крымінальнага [5, с. 13, 33]. Адсутнасць даносаў і асцярожнасць з кліентамі дазваляюць Мордуху і надалей весці свае справы.

Да былога карчмара заяўляецца і герой апавядання «З жыцця Лепельскіх сялян». Нагода ў яго зусім трывіяльная – проста выпіць. Пры гэтым адэкватнымі паводзінамі ён пахваліцца не можа, пачынае скандаліць, абражае карчмара і яго сям'ю. Як вынік – напіваецца да бяспамяцтва, так што жонка з суседам вымушаныя яго вывозіць [6].

Аднак часам сяляне вырашалі праблему адсутнасці гарэлкі самастойна. З увядзеннем манаполіі новая гарэлка была ўспрынятая па-рознаму. З аднаго боку, яна і «идёт лепше», і «горло не дереть», а з другога – і «в голову не даеть» [7, с. 29]. Ды і каштавала новая гарэлка значна больш. Выйсце было знойдзена ў выкурванні гарэлкі з палітурнага лаку. Падрабязны працэс выганкі дадзенага прадукту і яго эфекту апісаны А. Пшчолкам у апавяданні «Самагоншчыкі».

Абсталяванне для выкуркі складалася з катла і халадзільнай камеры: «в крышке котла небольшое отверстие. В последнее вставляется коленчатая

---

[1] Тут і далей захаваны арфаграфія і пунктуацыя арыгінала.

трубка. Трубка эта оканчивается небольшим сосудом без дна с двумя стенками с промежутком величиной с палец. Сосуд этот погружает Кондраш в ведерко с холодной водой. Маленькая трубочка проведена из ведерка наружу... из этой трубочки и течет водка, а в котле остается твердая масса» [7, с. 31]. За адну выкурку гэтакі апарат дазваляў пераганць два гарнцы лаку, што адпавядала палове вядра, ці прыкладна 6,15 л. Якасць і прадукцыйнасць залежалі ад тэмпературнага рэжыму – «огонёк держать слабенький». Для ачысткі ад прымешкаў і паляпшэння паху выкарыстоўвалі хлеб, праз які праганялі спірт. Пры парушэнні тэхналогіі спірт заставаўся ў хлебе. Так, адзін з самагоншчыкаў атрымаў пяць боханаў хлеба са спіртам і запрасіў суседзяў на пачастунак. Эфект быў моцны – у аднаго «тлум у галаве», у другога «у нагах зудуць». У выніку ўсе «полегли як дровы» [7, с. 30]. Атрыманы прадукт меў пах лаку, але карыстаўся папулярнасцю з-за таннасці сыравіны і простай тэхналогіі: «про монопольку забылися... теперь не только корчмари, но и бабы умеють гнать... веселле можно справить с 10 ведрами... крепость какую хочешь сделаем» [7, с. 29].

Пілі ў былых корчмах ці куплялі гарэлку для хатняга спажывання. Тут трэба было праявіць асаблівую асцярожнасць і сцерагчыся «цынизников» – акцызных чыноўнікаў. Каб пазбегнуць канфіскацыі тавару пры перавозцы, трэба было купіць яшчэ некалькі бутэлек у манапольцы.

Інфармацыю аб распаўсюджанасці праблемы самагонаварэння можна было б спісаць на літаратурную выдумку А. Пшчолкі і характэрнае перабольшванне, але яна пацвярджаецца і архіўнымі звесткамі. У 1912 г. на тэрыторыі Лепельскага і Полацкага паветаў рэйды супраць самагоншчыкаў праводзіла губернская паліцыя – з прычыны малапаспяховасці дзейнасці мясцовых уладаў і адсутнасці даверу да мясцовых праваахоўнікаў [2].

**Калі і як пілі сяляне?** Хоць А. Пшчолка і адзначаў, што п’юць сяляне шмат, але паўсядзённае п’янства было рэдкасцю. Масава пілі сяляне з нагоды кірмашоў, валасных сходаў, святаў ці значных жыццёвых падзей (вяселляў, пахаванняў і інш.).

На кірмашах пілі за сустрэчу, адзначалі куплю-продаж. Часам усё завяршалася масавай бойкай. Наступствы такой бойкі апісаны ў апавяданні «Замойжанскі кірмаш»: «на многих возах были видны беспомощно свешанные вниз головы, болтались руки и ноги» [6, с. 18].

Падчас валасных сходаў і судоў гарэлка, ці «балбатуха», была асноўным сродкам вырашэння ўсіх праблем. Характэрна, што галоўным чалавекам на сходзе ў значнай колькасці апавяданняў («Янкава скарга», «Валасная сходка», «Барылаўскі валасны сход») з’яўляецца пісар, які ці сам, ці праз сваіх падручных частуе гарэлкай старастаў, выбаршчыкаў ці старшыню, што дазваляе яму трымаць усіх пад кантролем [6, с. 78]. Напрыканцы сходу ўсе «карысныя» людзі запрашаліся на пачастунак, пасля якога «трезвые кое-как

доплелись до своих домов, прочие улеглись на лавках и под лавками, и на утро можно было видеть, как красные носы и затуманенные глаза являлись в "винополию" за похмелкой» [6, с. 64]. Сход мог выставіць патрабаванне старшыні купіць два вядры гарэлкі для паспяховых перавыбараў, адкупіцца гарэлкай фельчару ці настаўніку для працягу кантракта [6, с. 3, 59]. Фельчар у апавяданнях А. Пшчолкі выводзіцца сам горкім п'яніцам («Валасная сходка»), настаўнік – хоць і «непитущим», але бездапаможным. У яго няма паразумення з кіраўніцтвам воласці, а яго прапановы прыняць пратакол аб забароне п'янства выклікаюць наступны адказ: «Мы пьем за свои гроши! Ты нам грошей не давал на горелку!» [6, с. 59].

Месца гарэлкі ў народнай абраднасці разгледзім па апавяданні «Дзяды (этнаграфічны нарыс з жыцця Лепельскіх беларусаў)». Тут гарэлка выступае як частка народнай традыцыі, а яе спажыванне – як неабходнасць: «без горелки, известное дело, дедов не справить» [3, с. 4]. Спроба галоўнага героя – Мікіты Перуна – адмовіцца ад куплі гарэлкі выклікае здзіўленне і ціхае абурэнне аднавяскоўцаў і завяршаецца звышнатуральным здарэннем – з'яўленнем ноччу ў хаце Мікіты памерлага Кузьмы Пэцкаля. З улікам усяго гэтага Мікіта ўсё ж купляе некалькі бутэлек. Аднак гарэлка патрэбна не для дасягнення ап'янення, а для выканання своеасаблівага рытуалу. З пачаткам святочнай вячэры, пасля каштавання куцці, гаспадар, павярнуўшыся да вакна, бярэ бутэльку, налівае чарку і кажа: «Няхай же со святыми отпочиваюгь! Дай же им Боженька рай светлый и анёлов на уленях...» Пасля чарка пераходзіць да астатніх членаў сям'і, у тым ліку дзяцей, нават немаўляці даюць некалькі кропляў «для здароўя». Супраць гэтага выказваецца бацька малога – малодшы сын Мікіты, які часта ездзіць у горад і выступае своеасаблівым парушальнікам старых традыцый, але яго пратэст губляецца ў агульнай пазіцыі астатніх членаў сям'і [3, с. 19].

Значную колькасць гарэлкі выпівалі на вяселлях. Пры гэтым распіццё гарэлкі суправаджала ўсе стадыі: «выглядзіны» – непасрэдна сватанне, «выкармліванне» – абмеркаванне дэталяў вяселля ў хаце маладога, провады маладога і маладой, вясельны поезд і сам вясельны стол. Гаспадар сярэдняй рукі купляў на вяселле шэсць вёдзер гарэлкі, такое вяселле называлі «з гукам» – гучнае і адпаведнае ўсім традыцыям. За сталом прытрымліваліся традыцыі «гонять рюмку» – піць з адной чаркі па чарзе, перадаючы яе суседу. Асобны рытуал існаваў для музыкаў. Цымбалісту налівалі першую чарку, бо «цымбалы перасохлі», затым другую, бо «падмочаныя не так скрыпяць». Пэўная колькасць гарэлкі ішла на пачастунак тым, хто спыняў па дарозе вясельны поезд, – пакрыўдзіць такіх людзей лічылася дрэннай прыкметай [6, с. 189–191].

Тое, што гарэлка стала прысутнічала на вяселлях, адлюстравана ў адной з абрадавых песень, якую прыводзіць А. Пшчолка ў апавяданні «Піліпава вяселле»:

Ах, ты ведаеш, пане сваце,
Ехали мы по мхам, по балотам,
И прыехали к сватным варотам;
А сватныя бабы, як сароки,
Выбегли и зачынили нам вароты!
Мы чыста посклели-б,
Кали-б сваёй горэлки не мели б.
Вот мы стали сваю горэлку распивати,
А евоныя бабы стали пияти.
Яны пияли-пияли,
Яны хацели, каб мы им
Горэлки сваёй дали,
Но яны от нас такой ласки не достали,
И мы им сваёй горэлки не дали.
Яны з большаго стыда
Побегли, хто куда... [6, с. 203–204].

Рэзка асуджае А. Пшчолка традыцыю піць на пахаваннях. Дадзены сюжэт прысутнічае адразу ў трох апавяданнях: «Мікітавы хаўтуры», «Гарэлка на хаўтурах» і «Гарэлка (адказ сялянам)». У двух апошніх суседзі адмаўляюцца прыходзіць на пахаванне, бо ў хаце няма досыць гарэлкі, пры тым што гэта не свядомы выбар родных, а вынік іх беднасці і збегу абставінаў [4, с. 3; 6, с. 72]. Такія паводзіны аднавяскоўцаў трэба лічыць, хутчэй, аўтарскім перабольшваннем. Аб тым, чаму трэба купляць гарэлку, разважае сын памерлага Мікіты Сямён: «Любит наш брат горелку. Да што поделаешь? За грошы нанимать – каждому стыдно суседа хоронить, альбо яму копать... А без горелки горло пересохнеть, и топор из рук вывалицца. Ведомое дело: и сила от горелки приходить... и так в компанействе работа веселей!» [5, с. 32]. З крытыкай Сямёна выступае поп, які бачыць, што проста словы на сялян не дзейнічаюць, і звяртаецца да фінансавага боку праблемы. Два вядры гарэлкі, што купіў Сямён непасрэдна на пахаванне і жалобны стол, – гэта значная сума (каля 15 р.), якую можна было б пусціць на развіццё гаспадаркі і адукацыю дзяцей. Але і гэта водгуку ў Сямёна не знаходзіць. Усё, што можа зрабіць поп, гэта пакінуць жалобны стол пасля куцці і яшчэ раз, але зноў безвынікова, даць наказ не піць [5, с. 45].

**Дык чым жа была гарэлка для сялян?** Гэта не проста сродак ап’янення, бо часта яе спажыванне не было самамэтай. Гарэлка з’яўлялася часткай святочнай і сямейнай абраднасці, камунікатыўнага працэсу. У гэтых выпадках яе спажыванне лічылася нормай, а асуджалася часцей адмова ад яе. Разам з тым мелі месца і негатыўныя з’явы. Побач з «рытуальным» спажываннем шырылася і побытавае п’янства, якое суправаджалася развіццём рынку нелегальнага гандлю і вытворчасцю алкагольных сурагатаў, пагаршэннем эканамічнага становішча сялянскіх гаспадарак. Аднак цалкам адмовіцца ад гарэлкі – «шклянога бога» [6, с. 73] – для сялян было складана.

## Літаратура


1. *Васілевіч, У. А.* Збіральнікі / У. А. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 187 с.
2. *Мяньчэня, С. В.* Праблема самагонаварэння на Полаччыне напярэдадні і ў пачатку Першай сусветнай вайны (1911–1916 гг.) / С. В. Мяньчэня // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінар. даслед. : электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полац. дзярж. ун-та, г. Полацк, 19–20 крас. 2018 г. ; Полацкі дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – С. 554–559.
3. *П-ко, А.* Деды : (этнограф. очерк из жизни Лепельских белорусов) / А. П-ко. – Витебск : Губерн. типо-литогр., 1898. – 23 с.
4. *Пщёлко, А. Р.* Водка (ответ крестьянам) / А. Р. Пщёлко. – Вильна : Тип. «Русский почин», 1907. – 22 с.
5. *Пщёлко, А. Р.* Микитовы хаутуры : очерк из белорус. жизни / А. Р. Пщёлко. – Витебск : Типо-литогр. П. Подземскаго, 1910. – 53 с.
6. *Пщёлко, А. Р.* Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А. Р. Пщёлко. – Вильна : Тип. «Русский почин», 1906. – 248 с.
7. *Пщёлко, А. Р.* Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А. Р. Пщёлко. – Сб. 2. – Витебск : Типо-литогр. наследников М. Б. Неймана, 1910.
8. *Шлюбскі, А.* Пшчолка і «Вражда из-за языка» / А. Шлюбскі // Савецкая Беларусь. – 1926. – № 164. – С. 3–4.
9. *Шыпіла, І.* Хто яны? / І. Шыпіла // Савецкая Беларусь. – 1926. – № 157. – с. 4.


## Резюме

*С. В. Меньченя*

### АЛКОГОЛЬ В ЖИЗНИ КРЕСТЬЯН ЛЕПЕЛЬЩИНЫ НАЧАЛА XX в. (по произведениям А. Пщёлко)

Статья посвящена вопросам потребления крепкого алкоголя крестьянами Лепельщины в начале XX в. В качестве источника используются литературные произведения А. Пщёлко (1869–1943), основанные на местном этнографическом материале и наблюдениях автора. Отмечается, что сам автор осуждал народное пьянство и местами преувеличивал его масштабы. Наряду с негативными процессами умеренное потребление водки у крестьян было связано с обрядностью и вредным не считалось.

## Summary

*S. V. Menchenia*

### ALCOHOL IN THE LIFE OF THE PEASANTS OF THE LEPEL REGION AT THE EARLY XX CENTURY (by A. Pshcholka's works)

The article is devoted to the consumption of strong alcohol by the peasants of the Lepel region at the beginning of the 20th century. Literary works by A. Pshcholka (1869–1943), based on the local ethnographic materials and the author's observations, are used as a source. It is noted that the author himself condemned the people's drunkenness and in sometimes exaggerated its scale. Along with negative processes, the moderate consumption of vodka by the peasants was associated with rituals and was not considered harmful.